ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ
І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 30 (624) | Субота, 16 лістапада 1985 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап

*Абмяркоўваем перадз'ездаўскія дакументы ЦК КПСС*

## НА ГЛЫБОКАЙ НАВУКОВАЙ АСНОВЕ

Шырока абмяркоўваемы ў краіне праект новай рэдакцыі Праграмы КПСС характарызуецца поўным увасабленнем і **творчым развіццём марксісцка-ленінскага вучэння** аб шляхах камуністычнага будаўніцтва. У ім даецца глыбокая разгорнутая характарыстыка стратэгічных напрамкаў КПСС, Савецкай дзяржавы, усяго народа па ўдасканальванню сацыялізма і паступоваму пераходу да камунізма. Для праекта новай рэдакцыі Праграмы КПСС у цэлым уласцівы навуковы падыход, пераемнасць і наватарства. У праекце падкрэслена, што паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны — гэта стратэгічны курс партыі, нацэлены на якаснае пераўтварэнне ўсіх бакоў жыцця савецкага грамадства: карэннае абнаўленне яго матэрыяльна-тэхнічнай базы на аснове дасягненняў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі; удасканальванне грамадскіх адносін і ў першую чаргу эканамічных; глыбокія перамены ў змесце і характары працы, матэрыяльных і духоўных умовах жыцця людзей; актывізацыя ўсёй сістэмы палітычных, грамадскіх і ідэалагічных інстытутаў.

Для дасягнення вышэйшай мэты эканамічнай стратэгіі партыі на сучасным этапе — няўхільнага ўздыму матэрыяльнага і культурнага росту жыцця народа — неабходна ажыццявіць круты паварот да інтэнсіфікацыі грамадскай вытворчасці, забяспечыць пераход да эканомікі найвышэйшай арганізацыі і эфектыўнасці з усебакова развітымі прадукцыйнымі сіламі, сталымі сацыялістычнымі адносінамі, добра адладжаным гаспадарчым механізмам.

Галоўным рычагом узмацнення інтэнсіфікацыі і павышэння эфектыўнасці вытворчасці з'яўляецца паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу. Яно немагчыма без поўнага выканання планаў укаранення новай тэхнікі і тэхналогіі, узмацнення рэжыму эканоміі, карэннага паляпшэння якасці прадукцыі. Таму ў другі раздзел другой часткі новай рэдакцыі Праграмы КПСС мэтазгодна дадаць: **неабходна ўзмацніць адказнасць і эканамічнае стымуляванне ўсіх работнікаў за безумоўнае выкананне планаў укаранення новай тэхнікі і тэхналогіі, узмацненне рэжыму эканоміі, паляпшэнне якасці прадукцыі.**

**У. БОНДАРАЎ,**
**загадчык кафедры палітэканоміі, кандыдат эканамічных навук, дацэнт.**

## ПРАГРАМА РОСТУ

**«Вышэйшай мэтай эканамічнай стратэгіі партыі,** — падкрэслена ў праекце Асноўных напрамкаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986—1990 гады і на перыяд да 2000 года, — **быў і застаецца няўхільны ўздым матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця народа...**

Для паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу неабходна **«рашуча ўзняць ролю навукі і тэхнікі ў якасным пераўтварэнні прадукцыйных сіл».**

Такім чынам ставіцца задача далейшага ўмацавання сувязей навукі і вытворчасці, далейшага паляпшэння выкарыстання навуковага патэнцыялу вышэйшай школы, пашырэння аб'ёму выконваемых навуковых даследаванняў.

Нас, работнікаў вышэйшай школы, асабліва радуе тое, што будуць ажыццяўляцца меры па далейшаму паляпшэнню матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння навукі. Істотна ўзрасце аснашчэнне навуковых і вучэбных лабараторый сучаснымі прыборамі, абсталяваннем, матэрыяламі, сродкамі аўтаматызацыі, у якіх так востра маюць патрэбу нашы навуковыя і асабліва вучэбныя лабараторыі.

Калі ўчытваешся ў палажэнні праекта, разважаеш над яго лічбамі, то ясна ўсведамляеш важную асаблівасць намячаемай праграмы гаспадарчай і сацыяльнай дзейнасці — за кожным радком стаіць глыбокі, строга аб'ектыўны і ўсебаковы аналіз стану спраў, ацэнка рэальных магчымасцей і рэсурсаў нашай народнай гаспадаркі.

Кожны з нас на сваім рабочым месцы не пашкадуе сіл для паспяховага ажыццяўлення Асноўных напрамкаў, самаадданай працай унясе дастойны ўклад ва ўмацаванне эканамічнай магутнасці Радзімы.

**М. БАРАНАЎ,**
**асістэнт кафедры фізічнай метралогіі.**

## ВЫШЭЙ АДДАЧУ АД ЭВМ

**У раздзеле IV «Асноўных напрамкаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986—1990 гады і на перыяд да 2000 года»** вызначаны курс на далейшае расшырэнне выпуску ЭВМ і павелічэнне маштабаў іх прымянення: **«Арганізаваць выпуск персанальных камп'ютэраў. Забяспечыць рост аб'ёму вытворчасці вылічальнай тэхнікі ў 2—2,3 раза. Высокімі тэмпамі нарошчваць маштабы прымянення сучасных высокапрадукцыйных электронна-вылічальных машын усіх класаў. Прадоўжыць стварэнне і павысіць эфектыўнасць работы вылічальных цэнтраў калектыўнага выкарыстання, інтэгрыраваных банкаў дадзеных і перадачы інфармацыі».**

Прапаную ў гэтым абзацы ўзмацніць акцэнт на неабходнасць больш эфектыўнага выкарыстання вылічальнай тэхнікі, арганізацыйна не ўваходзячай у склад вылічальнай тэхнікі калектыўнага карыстання. А такой вылічальнай тэхнікі ў народнай гаспадарцы пераважная большасць. Гэта шматлікія ІВЦ і ВЦ аб'яднанняў (прадпрыемстваў), галіновых НДІ, акадэмічных інстытутаў, ВНУ і г. д. Таму больш канкрэтнай павінна быць фармуліроўка гэтай задачы: «Высокімі тэмпамі нарошчваць маштабы эфектыўнага прымянення сучасных высокапрадукцыйных электронна-вылічальных машын усіх класаў».

**Г. КОТАЎ,**
**дацэнт кафедры тэхнічных сродкаў апрацоўкі эканамічнай інфармацыі.**

*XXVII З'ЕЗДУ КПСС — ДАСТОЙНУЮ СУСТРЭЧУ!*

## ВЫЗНАЧАНЫ ПЕРАМОЖЦЫ

Новай яркай старонкай у гісторыю патрыятычнага руху ўпісаны здабыткі працоўнага семестра-85. У ім удзельнічала больш 1200 студэнтаў нашага універсітэта. Будаўнічымі атрадамі асвоена звыш 900 тыс. руб. капіталаўкладанняў. За дні ўдарнай працы і за ганаровых байцоў у грамадскія фонды пералічана 26832 рублі.

Студэнты універсітэта актыўна ўдзельнічалі ў грамадскім і палітычным жыцці. Імі прачытана 847 лекцый, дадзена 202 канцэрты, аказана дапамога 204 ветэранам вайны і працы, сем'ям загінуўшых воінаў. Па месцу дыслакацыі адрамантавана 29 школ, школьным бібліятэкам перададзена 381 кніга, пабудаваны і адрамантаваны 32 спартыўныя пляцоўкі. У год слаўнага 40-годдзя Вялікай Перамогі адрамантавана 48 помнікаў загінуўшым змагарам за наш шчаслівы сённяшні дзень.

У атрадах разам са студэнтамі працавала 90 «цяжкіх» падлеткаў. Праведзена вялікая мэтанакіраваная работа па іх перавыхаванню.

Аказана значная дапамога калгасам і саўгасам. Для іх нарыхтавана 979,3 тоны кармоў.

Паспяхова вёўся збор лекавых раслін. Для аптэк нарыхтавана 623 кг каштоўнай сыравіны.

Напярэдадні свята Вялікага Кастрычніка на сумесным пасяджэнні камітэта камсамола і прафкома студэнтаў ГДУ былі падведзены вынікі сацыялістычнага спаборніцтва паміж факультэтамі і атрадамі па фарміраванню і іх падрыхтоўцы, правядзенню працоўнага семестра-85.

Пераможцам **прызнаны біялагічны факультэт** (сакратар камсамольскага бюро Алена **Аўдашова**). Яму прысуджаны пераходны Чырвоны сцяг універсітэта.

Адпаведна другое і трэцяе месцы занялі **эканамічны і фізічны** факультэты (сакратар камітэта камсамола **Святлана Самаукіна**, сакратар камсамольскага бюро **Віктар Пракапенка**), якія ўдастоены пераходных чырвоных вымпелаў.

На наступных месцах — **гістфіл** (сакратар камітэта камсамола **Юрый Пенязь**) і **матэматычны факультэт** (сакратар камітэта камсамола **Эла Савянок**).

Па групе атрадаў будаўнічага напрамку пераможцам прызнаны СБА **«Эканаміст»** (камандзір **Юрый Тарасенка**, камісар **Валерый Ігнатаў**).

На другім месцы — СБА **«Волаты»** фізічнага факультэта (камандзір **Ігар Новік**, камісар **Канстанцін Козінаў**), трэцім — **«Памяць»** біялагічнага факультэта (камандзір **Генадзь Кавалёў**, камісар **Васіль Плашкоў**).

Па групе атрадаў небудаўнічага напрамку лепшых паказчыкаў дасягнуў атрад **«Сірыус»** эканамічнага факультэта (камандзір **Галіна Сергель**, камісар **Наталля Занкевіч**). На другім і трэцім месцах адпаведна СА **«Крышталь»** фізічнага факультэта (камандзір **Людміла Гулякова**, камісар **Тамара Лаўшук**) і **імя Міхаіла Мароза** біялагічнага факультэта (камандзір **Таццяна Шапавалава**, камісар **Алена Пашукевіч**).

Атрады, пераможцы сацыялістычнага спаборніцтва, на вечары працоўнай славы будуць узнагароджаны граматамі рэктарата, парткома, камітэта ЛКСМБ і прафкома студэнтаў.

*Фестываль «Беларуская музычная восень»*

## ПРЫНЯСЕ РАДАСЦЬ

20 лістапада ў нашай рэспубліцы прагучаць першыя акорды XII Усесаюзнага фестывалю мастацтваў «Беларуская музычная восень». Ён стане сімфоніяй дружбы народаў нашай шматнацыянальнай краіны, таму што ў ім прымуць удзел майстры мастацтваў Украіны, Малдавіі, РСФСР, Літвы, Беларусі, Азербайджана, а таксама замежныя госці з ЧССР, Югаславіі.

Адкрые фестываль заслужаны калектыў Малдаўскай ССР Дзяржаўны акадэмічны ансамбль народнага танца «Жок». Ён выступіць з канцэртамі ў Палацы культуры і тэхнікі чыгуначнікаў імя У. І. Леніна. Цяжка знайсці ў нашай краіне месца, дзе б не выступаў гэты праслаўлены калектыў, які заваяваў прызнанне гледачоў сваёй жыццярадаснасцю, дынамізмам і віртуёзнасцю. Жок — гэта сельскія народныя танцы, свята і месца, дзе праходзяць гулянні, таму назва ансамбля сімвалізуе радасць, весялосць, выражае любоў народа да музыкі, жартаў. За стварэнне высокамастацкіх праграм і творчыя поспехі калектыў удастоены прэміі Ленінскага камсамола, яму прысвоена званне «Акадэмічны».

З цікавай праграмай выступіць у Палацы культуры аб'яднання «Гомельпрамбуд» заслужаны дзеяч мастацтваў УССР, пісьменнік Ігар Шведаў, аўтар, рэжысёр і выканаўца літаратурна-музычнага цыкла «Ленініяна. XX стагоддзе».

Аматараў класічнай музыкі чакае сустрэча з заслужаным калектывам рэспублікі, лаўрэатам прэміі Ленінскага камсамола Літоўскім камерным аркестрам, канцэрты якога адбудуцца ў музычным вучылішчы імя Н. Ф. Сакалоўскага.

На сцэне актавай залы універсітэта ў дні фестывалю выступіць ансамбль старадаўняй музыкі «Кантабіле». У рэпертуары ансамбля — праграмы розных стылёвых напрамкаў: «Музыка барока», «Музыка Германіі, Італіі XVII—XVIII стагоддзяў», «Музычны Парыж XVIII ст» і інш. Ганаровае месца ў рэпертуары калектыву занялі творы Ф. Куперэна, Ж. Рамо, Г. Тэлемана, І. С. Баха і інш. Ансамбль з'яўляецца першым выканаўцам музыкі беларускага барока — «Полацкага сшытка» (бытавыя танцы і канцоны), самай ранняй і пакуль адзіна вядомай нам прафесіянальнай музыкі Беларусі XVI—XVII ст.

Білеты на канцэрты калектываў — удзельнікаў XII Усесаюзнага фестывалю мастацтваў «Беларуская музычная восень» выкладчыкі і студэнты ГДУ могуць набыць у прафкоме студэнтаў.

**Н. КОЛТЫШАВА,**
**старшыня прафкома студэнтаў.**

## НА ЎСТАНОВАЧНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ

Пазаўчора ў актавай зале адбылася ўстановачная канферэнцыя па стварэнню ва універсітэце пярвічнай арганізацыі добраахвотнага таварыства барацьбы за цвярозасць.

Заслуханы і абмеркаваны даклад аб задачах добраахвотнага таварыства барацьбы за цвярозасць, з якім выступіў загадчык кафедры ГА і медпадрыхтоўкі кандыдат медыцынскіх навук В. П. Дзядзічкін.

Выбраны саставы бюро і рэвізійнай камісіі універсітэцкай арганізацыі таварыства. Старшынёй бюро выбраны В. П. Дзядзічкін.

## НЕЎМІРУЧЫ ПОМНІК ЛІТАРАТУРЫ

Гістарычнай даце — 800-годдзю з часу стварэння «Слова аб палку Ігаравым» была прысвечана навуковая канферэнцыя аддзялення грамадскіх навук Акадэміі навук БССР, якая адбылася 12 лістапада ў Мінску. Уступным словам яе адкрыў віцэ-прэзідэнт АН БССР вядомы беларускі пісьменнік І. Я. Навуменка.

Аб ролі і месцы «Слова» у гісторыі сусветнай культуры, яго моўных асаблівасцях, уплыве на славянскае вершаскладанне, вобразны лад паэзіі гаварылі на канферэнцыі доктар філалагічных навук М. Г. Булахаў, член-карэспандэнт АН БССР А. І. Жураўскі, прафесар М. М. Грынчык, іншыя вучоныя. Яны падкрэслівалі, што «Слова» з'яўляецца неўміручым помнікам старажытнарускай літаратуры, сведчаннем высокай культуры юнай Русі.

У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел і выступілі з паведамленнямі загадчык кафедры беларускай літаратуры нашага універсітэта кандыдат філалагічных навук І. Ф. Штэйнер і выпускнік аспірантуры ГДУ, дырэктар Гомельскага СПТВ № 126 народных мастацкіх промыслаў М. М. Воінаў.

**(Наш кар.).**

## Са справаздач і выбараў факультэцкіх камсамольскіх арганізацый

# ПРА ПОСПЕХІ І ПРАЛІКІ

На справаздачна-выбарным камсамольскім сходзе біялагічнага факультэта ішла размова як аб становучых момантах у рабоце камсамольскай арганізацыі, так і аб недахопах.

Са справаздачным дакладам выступіла сакратар камсамольскага бюро факультэта Алена Аўдашова. Яна адзначыла, што бюро правяло пэўную работу па выхаванню камсамольцаў у духу пастаноў партыі і ўрада, імкнулася мабілізаваць юнакоў і дзяўчат на выкананне задач, пастаўленых XXVI з'ездам КПСС, XIX з'ездам ВЛКСМ, на дастойную сустрэчу чарговага XXVII з'езда партыі.

Галоўную ўвагу ў сваёй рабоце бюро ўдзяляла вучобе студэнтаў. Абсалютная паспяховасць на факультэце па выніках летняй сесіі склала 97,2%. Аднак яшчэ не ўсе камсамольцы добрасумленна адносяцца да свайго галоўнага абавязку —добра вучыцца. Яшчэ і цяпер ёсць на біяфаку студэнты, якія не ліквідавалі запазычанасцей. Сярод іх — І. Юданава, М. Купрацэвіч, Л. Рэут і іншыя.

На сходзе таксама адзначалася, што дрэнна абстаяць справы і з наведваннем студэнтамі заняткаў. Значыць, у гэтай справе не праявіла належнай патрабавальнасці вучэбна-выхаваўчая камісія. Яе новаму саставу трэба працаваць больш эфектыўна, не праяўляць паблажлівасці да заўзятых прагульшчыкаў.

Былі на факультэце і цікавыя, карысныя мерапрыемствы. Добрых слоў заслугоўваюць байцы студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Іх мінулым летам было чатыры, з якіх адзін — камуністычнай працы (камандзір А. Серадова, камісар І. Серпікава). Па працэнту ўдзелу студэнтаў у патрыятычным будаўнічым руху (50,7%) біяфак стаіць на першым месцы ва універсітэце.

Актыўна ўдзельнічаюць студэнты-біёлагі ў рабоце народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання. Рэгулярна працуе адкрыты ў мінулым навучальным годзе літаратурна-музычны цыкл «Поры года», нарадзіўся літаратурны клуб «Верас».

У спрэчках па дакладу прынялі ўдзел член камсамольскага бюро факультэта, адказны за работу ДНД С. Чубукоў, С. Нікалаева, адказная за дзейнасць народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання, камсорг гр. Б-21 Н. Доўста, дацэнт кафедры хіміі В. Р. Свірыдзенка, сакратар партыйнага бюро біяфака В. А. Хількевіч, дэкан факультэта С. Ф. Алешка і інш.

Работа камсамольскага бюро біялагічнага факультэта за справаздачны перыяд прызнана здавальняючай. На сходзе выбраны новы састаў бюро. Яго сакратаром зноў абрана Алена Аўдашова.

**А. ШАЛДУКОВА,**
**нам. сакратара камітэта ЛКСМБ ГДУ па арганізацыйнай рабоце.**

□

# КРАСВОРД БЯЗДЗЕЙНАСЦІ

Перад дзяўчатамі ляжаў разгорнуты часопіс з красвордам. Клетачкі яго хутка запаўняліся літарамі, і дзяўчаты задаволена пераходзілі да разгадкі наступнага слова. За размовай упаўголаса паміж сабой ім не чуваць было, аб чым у гэты час гаварыў з трыбуны справаздачна-выбарнага камсамольскага сходу сакратар камсамольскага бюро матфака Віктар Шведаў. А ўслухацца трэба было б, таму што аб далёка не бліскучым становішчы спраў у камсамольскай арганізацыі гаварыў сакратар. Будучыя матэматыкі па ўзроўню паспяховасці пасля летняй сесіі займаюць ва універсітэце перадапошняе шостае месца — апярэджваюць толькі факультэт фізвыхавання. Ёсць такія студэнты, якія не здалі па 5 залікаў і па 4 (!) экзамены. Колькасць прапушчаных матэматыкамі вучэбных гадзін без уважлівых прычын дасягае унушальных лічбаў. У камсамольскіх групах не створана атмасфера строгай патрабавальнасці да двоечнікаў і прагульшчыкаў, якія бессаромна закрэсліваюць свае прозвішчы ў выпусках факультэцкага «Камсамольскага пражэктара»...

І калі б адарваліся камсамолкі хаця на некалькі мінут ад свайго «захапляючага» занятку, можа зразумелі б, што прагучаўшыя з трыбуны і непачутыя імі словы В. Шведава: «Пасіўнасць і безадказнасць большасці камсамольцаў —вось асноўная прычына нашых недахопаў» самым непасрэдным чынам датычыць і іх.

Дык ці не з такіх вось абыякавых адносін, як у гэтых дзяўчат, да ўсяго, што хвалюе камсамольцаў матэматычнага факультэта, пачынаюцца ўсе недахопы і пралікі ў рабоце камсамольскай арганізацыі? Так, менавіта з іх. Прынцыпа «мая хата з краю», на жаль, прытрымліваюцца многія юнакі і дзяўчаты. Таму таксама крытычны характар насілі на сходзе выступленні старасты групы МП-45, ленінскай стыпендыяткі Алены Цімашэнка, якая гаварыла аб тым, што студэнт павінен памятаць не толькі свае правы, але і абавязкі, старшыні студсавета інтэрната № 2 Алы Кутаевай, членаў камсамольскага бюро факультэта Таццяны Давыдзенка, Алега Несцерава, намесніка сакратара партбюро матфака В. А. Васільева, члена парткома універсітэта дацэнта У. І. Міроненкі, намесніка сакратара камітэта камсамола ГДУ па аргрaбоце А. Шалдуковай. Усе яны гаварылі аб неабходнасці паляпшэння становішча спраў у камсамольскай арганізацыі.

Крытычна ацэньваючы пралікі і недапрацоўкі ў рабоце камсамольскага бюро матфака, якія прывялі да недобрасумленных адносін студэнтаў да свайго галоўнага абавязку — вучобы, да невыканання многімі камсамольцамі грамадскіх абавязкаў і даручэнняў, сход прыняў пастанову, нацэленую на павышэнне свядомасці юнакоў і дзяўчат, узмацненне ролі камсамольскай арганізацыі ў барацьбе за дысцыпліну.

У пачатку справаздачна-выбарнага сходу ў дакладзе В. Шведава нямала было сказана і аб добрых справах камсамольцаў факультэта. Задача новага саставу камсамольскага бюро, сакратаром якога абрана студэнтка 3-га курса Эла Савянок, працаваць так, каб добрыя справы значна пераважалі над усім негатыўным.

...Да канца сходу аматары красвордаў не змаглі адгадаць усе словы і некалькі клетачак засталіся пустымі. А варта было б узяць камсамолкам у рукі чырвоны аловак і запоўніць пустату словамі: «безадказнасць», «абыякавасць», «пасіўнасць». Менавіта іх яны праяўляюць да жыцця камсамольскай арганізацыі, членамі якой з'яўляюцца. Тады б красворд быў разгаданы поўнасцю...

**Т. НІКАЛАЕВА.**

□

# ВУЧОБА— СПРАВА ПЕРШАРАДНАЯ

29-га кастрычніка адбыўся справаздачна-выбарны камсамольскі сход геалагічнага факультэта. Са справаздачным дакладам на ім выступіў сакратар камсамольскага бюро геафака Мікалай Анціпчук.

У будучых геолагаў звычайна вельмі нізкай была паспяховасць першакурснікаў. Па выніках мінулай зімовай і летняй сесій яна склала адпаведна 66% і 70,8%. Чым гэта растлумачыць? У справаздачным дакладзе гаварылася аб тым, што першакурснікі яшчэ недастаткова адаптыраваліся ў сценах універсітэта, не ўвайшлі ў каляіну студэнцкага жыцця. Але, на мой погляд, справа ў тым, што першакурснікі не да канца ўсвядомілі: вучоба ва універсітэце — гэта не вучоба ў школе. А камсамольскае бюро факультэта мала ўвагі ўдзяліла першакурснікам. Той факт, што толькі тры студэнты здалі летнюю сесію на «выдатна», гаворыць сам за сябе. Гэта крайне мала для такога факультэта, як геафак. У камсамольскіх групах не створана атмасфера нецярпімасці да гультаёў і прагульшчыкаў. Аб гэтым гаварылася і ў справаздачным дакладзе, і ў выступленнях камсамольцаў факультэта.

У камсамольскага бюро ёсць яшчэ нямала нявырашаных пытанняў. Але самае галоўнае з іх — дабіцца такога становішча спраў, калі кожны камсамолец будзе ведаць, што ні адзін яго недастойны ўчынак не застанецца без спагнання. За ўсё, што ён зробіць добрага, яго заахвоцяць, а за негатыўнае — спытаюць з усёй камсамольскай строгасцю і прынцыповасцю.

На пасяджэнні новага саставу выбранага на справаздачным сходзе камсамольскага бюро яго сакратаром выбраны Вячаслаў Дашкевіч.

□

# ПАТРАБУЕ ІМЯ КАМСАМОЛЬЦА

У справаздачным дакладзе сакратара камсамольскага бюро фізічнага факультэта Віктара Пракапенкі прагучала заклапочанасць аб тым, што на фізфаку расце колькасць пасрэдных студэнтаў, «троечнікаў» і зніжаецца працэнт выдатнікаў. Камсамольскае бюро выкарыстоўвала ў сваёй рабоце розныя формы і метады, каб паспяховасць на факультэце палепшылася, аднак яму не хапіла настойлівасці давесці пачатую справу да канца. Яму трэба было прымяняць больш строгія меры камсамольскага ўздзеяння да нядбайных студэнтаў, якія не хацелі вучыцца, а пры неабходнасці — нават хадайнічаць перад дэканатам аб выключэнні такіх студэнтаў з універсітэта. Даўно настаў час зразумець студэнтам, і не толькі фізфака, але і ўсіх астатніх факультэтаў, што ніхто не будзе іх цягнуць «за вушы» да дыплома.

Нядрэнных поспехаў дабіліся будучыя фізікі ў студэнцкім будаўнічым руху. Па выніках трэцяга працоўнага семестра 1985 года факультэт заняў прызавое трэцяе месца, а СА «Волаты» і «Крышталь» занялі другое і трэцяе месцы ў сацыялістычным спаборніцтве сярод атрадаў адпаведна будаўнічага і небудаўнічага напрамкаў. Разам з тым камсамольскае бюро недастаткова ўдзяляла ўвагі падбору кіраўнікоў студэнцкіх атрадаў, што прывяло да непажаданых вынікаў: СА «Рамантыкі» і фарміраваўся з цяжкасцямі, і ў рабочы перыяд дапусціў неапраўданыя зрывы.

На жаль, некаторыя камсамольцы, і не толькі фізічнага факультэта, забыліся пра важнейшы абавязак члена ВЛКСМ — актыўна ўдзельнічаць у рабоце пярвічных камсамольскіх арганізацый. Тады б пры даручэнні студэнту таго ці іншага ўчастка работы не раздаваліся воклічы: «А што мне за гэта будзе?» Выкананне ж камсамольскага даручэння і ёсць канкрэтны ўдзел юнака і дзяўчыны ў рабоце камсамольскай арганізацыі.

І ў дакладзе, і ў выступленнях адчувалася заклапочанасць камсамольцаў за становішча спраў на факультэце, ускрываліся прычыны недахопаў, намячаліся шляхі іх ухілення.

У рабоце сходу прынялі ўдзел сакратар партбюро факультэта Т. П. Жалонкіна, намеснік дэкана І. В. Семчанка.

Выбраны новы састаў камсамольскага бюро, сакратаром якога зноў абраны Віктар Пракапенка.

**В. СЦЯПУРА,**
**нам. сакратара камітэта ЛКСМБ ГДУ па ідэалагічнай рабоце.**

* * *

На прайшоўшых справаздачна-выбарных камсамольскіх сходах гісторыка-філалагічнага, эканамічнага факультэтаў і факультэта фізвыхавання сакратарамі камсамольскіх бюро выбраны адпаведна Юрый Пенязь, Святлана Самаукіна і Людміла Намаюнас.

---

*Конкурс «Ану, першакурснік!»*

# УЗНАГАРОДЫ ЗАСЛУЖЫЛІ ЛЕПШЫЯ

Познім вечарам 3-га лістапада ў актавай зале універсітэта панавала хваляванне: хто ж будзе пераможцам толькі што прайшоўшага агульнауніверсітэцкага конкурсу «Ану, першакурснік!»? Ён працягваўся больш сямі гадзін. Стаміліся і яго ўдзельнікі, і гледачы. Але калі на сцэну выйшлі члены журы, каб аб'явіць вынікі, усе ажывіліся.

Першае месца прысуджана першакурснікам гісторыка-філалагічнага і эканамічнага факультэтаў. Другое — было вырашана не прысуджаць нікому, а трэцяе занялі студэнты 1-га курса факультэта фізічнага выхавання.

Праграма гістфіла была разнастайнай па жанрах, нумары выконваліся на дастаткова высокім узроўні. Граматамі ўзнагароджаны хараы і танцавальны калектывы. Адзначаны выступленні А. Марэнінай, якая праспявала песню «Па вуліцы маёй», і Т. Мацвеевай за беларускую народную песню «Ці свет, ці світае?». Былі ў праграме і гумарыстычныя нумары. Удала выканаў літаратурныя пародыі В. Пратапопаў. Яны выклікалі ў зале шчыры смех.

Бачна было, што старанна падрыхтаваліся да агульнауніверсітэцкага агляду талентаў першакурснікі эканамічнага факультэта. Многія ўдзельнікі конкурсу адзначаны граматамі. За лепшае выкананне эстраднага танца ўзнагароджаны танцавальны калектыў. Арыгінальным было выступленне В. Харанека, якая выканала ўкраінскую мелодыю на цымбалах. Спадабалася гледачам і апрацоўка цыганскага танца на домбры і фартэпіяна ў выкананні Л. Тарабукінай і Г. Мірашнічэнка. Адзначана выступленне І. Ліпая і С. Кажамякіна, якія паказалі сцэнку «На экзамене».

Парадавалі журы, гледачоў сваімі выступленнямі на конкурсе першакурснікі факультэта фізвыхавання, якія здолелі ўвайсці ў лік пераможцаў конкурсу. За высокае выканаўчае майстэрства ўзнагароджаны танцавальная група за адзін з выкананых ёй танцаў, іншыя ўдзельнікі агляду.

Будучыя біёлагі паказалі вясёлую, гумарыстычную праграму. Граматы ўдастоена А. Грыгарэнка, якая выканала песню «Белая шыпшына». Цёпла ўспрынялі гледачы выступленне С. Сударэнка. Яна прачытала маналог «Алё, мама!»

Лепшым магло б быць выступленне першакурснікаў матэматычнага факультэта. Заняць больш высокае месца яны не змаглі з-за некаторых арганізацыйных недапрацовак. Задуманая будучымі матэматыкамі цікавая вакальна-харэаграфічная кампазіцыя «Калі збіраецца маладосць свету» ледзь не сарвалася з-за непадрыхтаванасці фанаграмы. Былі ў матэматыкаў і асобныя ўдалыя нумары. Журы вызначыла лепшы вакальны дуэт — І. Цукрову і Ю. Філончык за выкананне імі песні «Стары раяль».

Так ужо склалася, што першакурснікі фізічнага факультэта паказваюць на агульнауніверсітэцкім аглядзе талентаў гумарыстычную праграму. Але на гэты раз яна была не вельмі цікавай. Здолелі паказаць сваё высокае выканаўчае майстэрства чытальнікі Г. Сідарук, гітарны дуэт у складзе В. Прусава і Ю. Свірыдзенкі, Г. Старавойтаў пры выкананні песні «Ні пуху, ні пер'я!»

Сярод прадстаўленых на конкурс першакурснікамі геафака нумароў трэба адзначыць выступленне І. Ёлкінай, якая сыграла на фартэпіяна «Варыяцыі» Глінкі, і гітарны дуэт у складзе С. Сакалова і М. Анфілатава.

Як заўсёды, пасля выступлення першакурснікаў на сцэну выйшлі ўдзельнікі «СТЭМа» і студэнцкага тэатра «Люстэрка». Старшакурснікі вельмі хутка падрыхтавалі пародыі на няўдалыя нумары, паказалі мініяцюру аб практыцы ў школе.

Пераможцы конкурсу ўзнагароджаны граматамі камітэта камсамола і прафкома студэнтаў універсітэта, падарункамі.

**І. НЕШЫК,**
**студэнтка 4-га курса эканамічнага факультэта, старшыня прэс-цэнтра.**

*Творчая сустрэча*

# «НЕЦІКАВЫХ РОЛЯЎ НЕ БЫВАЕ»

Здараюцца ў жыцці артыста такія выпадкі, што карэнным чынам уплываюць на яго далейшы шлях у мастацтве. Пятнаццаць гадоў назад нешта падобнае сталася і з Пятром Сяргеевічам Вельямінавым, цяпер народным артыстам РСФСР, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі СССР, а тады мала каму вядомым акцёрам Свярдлоўскага драматычнага тэатра.

Які артыст не марыць здымацца ў кіно, ды яшчэ ў галоўных ролях? Але адна справа мары, а другая... І ўсё ж лёс падарыў П. С. Вельямінаву сустрэчу з вядомымі рэжысёрамі кінастудыі «Масфільм», стрыечнымі братамі Усковым і Краснапольскім, якія прапанавалі яму, правінцыяльнаму акцёру, адну з цэнтральных роляў у сваім фільме «Цені знікаюць апоўдні».



І можа таму, што такое нечаканае запрашэнне на «Масфільм» аказала на П. С. Вельямінава вельмі моцнае ўражанне, ён да гэтага часу памятае ўсё да драбніц: і як праходзілі кінапробы на ролю Захара Бальшакова, і як здымаўся кожны эпізод фільма. Ён і прынёс шырокую папулярнасць артысту, якога «адкрылі» для вялікага кіно Ускоў і Краснапольскі. Безумоўна, поспех фільму, пастаўленаму гэтымі рэжысёрамі, забяспечыў перш за ўсё выдатны літаратурны матэрыял — аднайменны раман А. Іванова, па-другое — таленавіты акцёрскі ансамбль, у які арганічна ўпісаўся і П. С. Вельямінаў.

Роля сакратара райкома Палікарпа Кружыліна яшчэ ў адной тэлевізійнай экранізацыі рамана А. Іванова — «Вечны кліч» і ў тых жа рэжысёраў — другая значная акцёрская работа П. С. Вельямінава. Шмат сіл, таленту ўкладзена ім у гэтую ролю, з якой не расставаўся артыст на працягу 10 гадоў. Бо столькі часу занялі здымкі 19 серый гэтага маштабнага тэлевізійнага палатна аб жыцці Сібіры.

Усяго ж за 15 гадоў працы ў кінематографе П. С. Вельямінаў зняўся ў 40 фільмах. Каб пазбегнуць паўтораў, ён не імкнуўся здымацца ў ролях аднапланавых, станоўчых, у нечым адна на адну падобных.

— Трэба не іграць станоўчых герояў, а іграць добрыя ролі, — зазначыў Пётр Сяргеевіч у час творчай сустрэчы.

У пацвярджэнне сказанага ім мы можам, напрыклад, прыгадаць фільм з яго ўдзелам — «Пыл пад сонцам». У ім роля генерала Мураўёва, выкананая П. С. Вельямінавым, на адным з кінафестываляў была прызнана лепшай мужчынскай адмоўнай роляй.

Творчая біяграфія народнага артыста звязана з выдатнымі савецкімі рэжысёрамі — Г. Аляксандравым, Б. Ваўчком, В. Дорманам. Пашчасціла яму здымацца разам са славутай Верай Арловай, абаяльнай Лілітай Азаліня.

Цікавыя вобразы былі створаны П. С. Вельямінавым і на сцэне Маскоўскага тэатра «Современник».

Чалавек шчыры, творчы, з добрым пачуццём гумару — такім паўстаў перад намі ў час творчай сустрэчы народны артыст РСФСР П. С. Вельямінаў. І ўсе, хто прыйшоў на гэту сустрэчу, — выкладчыкі і студэнты, кнігалюбы, слухачы факультэта кінамастацтва і тэатральнага мастацтва народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання на вартасці ацанілі цікавасць знаёмства з любімым артыстам.

**Т. ДУБЯК.**

**НА ЗДЫМКУ: на сцэне актавай залы ГДУ — народны артыст РСФСР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР П. С. Вельямінаў.**

Фота Д. Баярына.

# БАЕЦ НА ЛІНІІ АГНЮ

## СПОЎНІЛАСЯ 90 ГАДОЎ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ВЯДОМАГА САВЕЦКАГА ПАЭТА ЭДУАРДА БАГРЫЦКАГА

Калі Э. Багрыцкаму (Дзюбіну) было 20 гадоў, на старонках адэскіх газет і калектыўных зборнікаў маладых паэтаў, якія выдаваліся ў 1915—1917 г.г. у г. Адэсе, з'явіліся першыя яго вершы.

Вялікую Кастрычніцкую сацыялістычную рэвалюцыю Э. Багрыцкі сустрэў з захапленнем. У 1918 годзе, пасля кароткачасовага знаходжання на Персідскім фронце, ён вяртаецца ў Адэсу, дзе здолеў знайсці сваё месца ў барацьбе з контррэвалюцыяй. У гэты час стварыў баявыя плакаты РОСТА У. Маякоўскі, працягваў работу паэта-трыбуна ў «Праўдзе» Д. Бедны, абаранялі заваёвы рэвалюцыі Д. Фурманаў, А. Фадзееў, М. Ціханаў, У. Вішнеўскі і іншыя маладыя савецкія пісьменнікі. У іх ліку быў і Эдуард Багрыцкі. Ён мог бы пра сябе сказаць: «Мяне зрабіла паэтам Кастрычніцкая рэвалюцыя».

З юнацкіх гадоў расла ў сэрцы Багрыцкага нянавісць да мяшчанства, свету хціўцаў. Цяпер паэт зразумеў, што гэты свет смяртэльна пагражае маладой сацыялістычнай рэспубліцы. У саставе асобага партызанскага атрада Э. Багрыцкі выязджаў на фронт, пісаў тэксты лістовак і адозваў да рабочых і сялян з заклікам уступаць у Чырвоную Армію, вёў актыўную прапагандысцкую работу. Паэт быў у гушчыні падзей. Але ён не хацеў абмяжоўвацца толькі работай агітатара, лектара, таму што сустрэўся з новым, масавым пралетарскім чытачом. Падзеі, у якіх прымаў удзел сам Э. Багрыцкі, аказалі значны ўплыў на характар яго творчасці. У 1921—1924 г.г. паэт актыўна супрацоўнічае ў адэскіх газетах «Известия» і «Моряк», дзе друкуюцца яго вершы на тэмы дня, лірычныя вершы, пераклады. Зварот да вершаў паэтаў-дэмакратаў Р. Бёрнса і Т. Гуда, да авеянай духам шатландскай народнай творчасці балады В. Скота быў для Э. Багрыцкага надзвычай плённым. «Песня аб кашулі», «Джон Ячменнае Зерне», «Разбойнік», уключаныя паэтам у кнігу «Паўднёва-Захад», як і «Вясёлыя жабракі», апублікаваныя пазней у зборніку «Пераможцы», — гэта вольныя пераклады. У іх паэт узмацніў матывы сацыяльнага пратэсту.

Эдуард Багрыцкі быў адным з арганізатараў першага ў Адэсе рабочага літаратурнага аб'яднання «Патокі Кастрычніка». Ён выступаў з лекцыямі аб класічнай і сучаснай паэзіі, чытаў вершы Пушкіна, Лермантава, новыя паэмы Маякоўскага. У 1923—1924 г.г. быў апублікаваны цыкл яго вершаў, прысвечаных Пушкіну.

Да ліку твораў, якія вызначаюць далейшы творчы рост паэта, трэба аднесці прасякнуты грамадзянскім пафасам, прысвечаны міжнароднай салідарнасці працоўных верш Багрыцкага «Кастрычнік», а таксама накіраваны супраць імперыялістаў верш «Папярэджанне».

«Дума пра Апанаса» была першым эпічным творам Э. Багрыцкага, поўнасцю пабудаваным на канкрэтным жыццёвым матэрыяле. У ім расказваецца аб трагічным лёсе ўкраінскага селяніна Апанаса, які спрабаваў у час грознай класавай барацьбы застацца нейтральным, засцерагчы сваё маленькае асабістае шчасце. Голас паэта гучыць гнеўна, ён абвінавачвае героя ў здрадніцтве. І разам з тым гэты голас поўны любві да тых, хто аддаў жыццё за народ.

У 1932 годзе Э. Багрыцкім былі напісаны тры паэмы — «Апошняя ноч», «Чалавек з прадмесця» і «Смерць піянеркі», якія ўваходзілі ў трэці і апошні выдадзены пры жыцці паэта зборнік. У «Апошняй начы» паказаны рост класавай свядомасці маладога пакалення, на плечы якога леглі цяжкія выпрабаванні. Успамінаючы загінуўшых таварышаў, чыю «честную память хранят холмы в обветренных будяках», паэт гаворыць ад імя свайго пакалення, загартаванага вайной:

**Но мы — мы живы наверняка!**
**Осыпался, отболев,**
**Скарлатинозною шелухой**
**Мир, окружавший нас...**

Сцяг многіх вершаў Эдуарда Багрыцкага — маладосць. Каму з нас невядомы радкі:

**Нас водила молодость**
**В сабельный поход,**
**Нас бросала молодость**
**На кронштадский лёд.**
**Боевые лошади**
**Уносили нас,**
**На широкой площади**
**Убивали нас.**

Маладосць Краіны Саветаў увасоблена і ў вобразе піянеркі Валі з паэмы «Смерць піянеркі», прысвечанай мужнай дзяўчынцы, якая смела паўстала супраць забабонаў старога свету.

...Э. Багрыцкі адчуваў сябе байцом на лініі фронту. Ён не баяўся смерці. Цяжкая хвароба ў 37 гадоў не перашкаджала паэту глыбока адчуваць прыгажосць новага жыцця і вастрыню барацьбы са старым укладам.

Творчасць Э. Багрыцкага раскрывае паэзію рэвалюцыйнай барацьбы. Моцна і страсна гучаць яго радкі сёння, і гэтак жа будуць яны гучаць для новых пакаленняў, уступаючых у жыццё.

**А. КАСТАГРЫЗ,**
**студэнтка 3-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

*Практыка студэнтаў*

# У САЮЗЕ З ТВОРЧАСЦЮ

Мы, студэнты-пяцікурснікі гісторыка-філалагічнага факультэта, праходзілі педагагічную практыку ў СПТВ № 126 г. Гомеля. Для нас тут усё было надзвычай цікава. Вучылішча вельмі прыгожа аформлена, у некаторыя майстэрні, кабінеты заходзіш, як у казку. І ўся гэтая прыгажосць створана самімі навучэнцамі пад кіраўніцтвам вопытных майстроў і педагогаў.

Нам таксама вельмі захацелася пакінуць пасля сябе добрую памяць. Доўга думалі, што для гэтага можам зрабіць. І ўрэшце вырашылі правесці цікавае мерапрыемства — Тыдзень беларускай літаратуры. Праходзіў ён у вучылішчы народных мастацкіх промыслаў з 21 па 26 кастрычніка і прадугледжваў самыя разнастайныя формы.

Першы дзень Тыдня пачаўся конкурсам насценных газет, прысвечаных беларускім пісьменнікам. Усе групы падрыхтавалі такія змястоўныя і маляўнічыя газеты, што нам цяжка было вылучыць лепшую. Каб іх змаглі прачытаць усе навучэнцы, мы аформілі выстаўку. Нікога не пакінула абыякавым і выстаўка работ навучэнцаў вучылішча «Вобразы мілыя роднага краю». Тут было шмат і асенніх букетаў, конкурс якіх завяршыў першы дзень Тыдня беларускай літаратуры.

Назаўтра знаўцы роднай літаратуры сабраліся на віктарыну «Ці ведаеш ты творчасць Я. Купалы і Я. Коласа?» Мы падабралі для віктарыны пытанні цікавыя, змястоўныя і складаныя. Але, нягледзячы на ўсе цяжкасці, рабяты змаглі даць адказы на ўсе пытанні.

На трэці дзень мы запрасілі ў вучылішча карэспандэнта газеты «Пионерская правда» па Беларусі В. Марозава, паэтэсу В. Вярбу, кампазітара Э. Зарыцкага, спевака В. Кучынскага. Усе яны расказалі крыху пра сябе, пра сваю творчасць. В. Вярба прачытала вершы са свайго новага зборніка «Ярасланна», Э. Зарыцкі выканаў некалькі сваіх песень, потым выступаў В. Кучынскі. Кожнага з гасцей пасля іх выступлення ўдзячныя гледачы доўга не адпускалі са сцэны гарачымі апладысментамі.

Чацвёрты дзень павінен быў выявіць пераможцаў конкурсу чытальнікаў. Жадаючых прадэманстраваць свае здольнасці сярод навучэнцаў знайшлося шмат. Гучалі вершы класікаў беларускай літаратуры, сучасных паэтаў. Адчувалася, што да конкурсу навучэнцы падрыхтаваліся добра. Паэтычныя радкі чыталіся імі выразна, эмацыянальна, пранікнёна.

У пятніцу праходзіла літаратурна-мастацкая кампазіцыя «Нам засталася спадчына», прысвечаная творчасці песняра беларускай літаратуры Я. Купалы. Мы падрыхтавалі да яе выстаўку твораў Я. Купалы. Гучалі песні на вершы паэта, вершы аб ім, усłаўляючыя яго імя.

Апошні дзень Тыдня беларускай літаратуры стаў днём падвядзення вынікаў. Мы давалі ацэнку праведзеным мерапрыемствам, адзначылі актыўных іх удзельнікаў, пераможцаў конкурсаў. Адбылося ўзнагароджанне пераможцаў.

Нам прыемна было бачыць і адчуваць, што мы змаглі зацікавіць навучэнцаў падрыхтаванымі і праведзенымі конкурсамі, віктарынамі, сустрэчамі, прысвечанымі роднай літаратуры.

Мы самі, як практыканты, за гэты час многаму навучыліся: адчулі, што праца педагога не вельмі лёгкая, але ўдзячная, знайшлі дзелавыя кантакты з выкладчыкамі, і наогул палюбілі вучылішча. Нават шкада было развітвацца з ім, з навучэнцамі, для якіх мы вялі ўрокі роднай мовы і літаратуры. У апошні раз прайшлі мы па вучылішчу, зазірнулі ў яго кабінеты і майстэрні, наведалі цудоўны музей, уздыхнулі і пакрочылі да аўтобуснага прыпынку. На душы стала сумна. Але чаму ж сумаваць? Мы — студэнты апошняга курса, пройдзе год і мы станем педагогамі, раз'едземся на месцы працы. І хто ведае, можа каму-небудзь з нас пашчасціць працаваць тут, у СПТВ № 126 народных мастацкіх промыслаў? А пакуль што — вучоба ў родным універсітэце.

**С. СЕМЯНЦОВА,**
**студэнтка гр. БР-51 гісторыка-філалагічнага факультэта.**

**НА ЗДЫМКУ: студэнты-практыканты гісторыка-філалагічнага факультэта ў музеі вучылішча народных мастацкіх промыслаў.**

Фота У. Чысціка.



